Дзядзінкіна, С. Старадаўнія пейзажы цэнтра Еўропы / С. Дзядзінкіна // Народнае слова. – 2005. – 30 жн. – С. 8.

СТАРАДАЎНІЯ ПЕЙЗАЖЫ ЦЭНТРА ЕЎРОПЫ

Возера Доўгае вядомае тым, што глыбейшага за яго вадаёма ў Беларусі няма. У энцыклапедычным выданні «Водные ресурсы Витебской области» я знайшла: максімальная глыбіня – 53,6 м, плошча водазбора – 30,4 кв. км. У летні час вада праграваецца да 18–20 градусаў толькі ў паверхневым слоі, на глыбіні 7–8 метраў, а ніжэй 20 метраў тэмпература не падымаецца вышэй 5–6 градусаў. З 1979 года Доўгае з'яўляецца рэспубліканскім гідралагічным заказнікам.

Нядаўна тут дзякуючы намаганням старшыні Псуйскага сельсавета Пятра Юруця, Глыбоцкай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і мясцовага лясніцтва вырашылі адрадзіць панскі маёнтак пад назвай Галубаў сад. Пра драўляны панскі палац пакуль гаворкі не ідзе, а вось сам востраў, на якім быў маёнтак, ужо значна добраўпарадкавалі, пачысцілі ад здзічэлага хмызняку.

«Гэты маляўнічы куток сапраўды знаходзіцца на востраве, – гаворыць Пётр Юруць. – Вось бераг Доўгага, а з возера выцякае рачулка Даўжанка, якая аддзяляла сад. Гэтыя мясціны належалі пану Чаховічу. На высокім узгорку стаялі палац і капліца. У кветніку было многа розных раслін, а ў садках - экзатычныя рыбкі. У час Першай сусветнай вайны тут праходзіла лінія фронту і драўляныя панскія пакоі згарэлі, уцалелую капліцу разабралі на дровы».

З 1926 года зямлю набыў мясцовы бізнесмен Канстанцін Галуб. Ён вырошчваў клубніцы і гародніну. Відаць таму і засталася назва – Галубаў сад. Ёсць прапанова перадаць гэтыя мясціны пад ахову, зрабіць заказнік на тэрыторыі 18,4 гектара. Ужо падрыхтавана і навуковае абгрунтаванне, якое выканалі супрацоўнікі Інстытута заалогіі Акадэміі навук Беларусі. Яны адзначылі, што бераг возера Доўгае ўваходзіць у нацыянальную прыродаахоўную сістэму: Гінькава–Свядава–Доўгае–Шо–Пліса. Гэтыя азёры звязаны паміж сабой пратокамі. Рэчка Шоша, напрыклад, звязвае Доўгае і Шо.

Звярнулі ўвагу навукоўцы і на тое, што тут (каля возера Шо) вызначаны геаграфічны цэнтр еўрапейскага кантыненту, таму мясціны з'яўляюцца перспектыўнымі для развіцця нацыянальнага і міжнароднага турызма. Да таго ж, старадаўні пейзажны парк нядрэнна захаваўся.

Пра тое, што ў самым цэнтры Еўропы і зараз можна сутыкнуцца з сівой даўніной, сведчыць і Пётр Юруць. Старшыня сельсавета – аматар рыбнай лоўлі. А любімае яго месца – рэчка Шоша. Нядаўна ён закінуў вудачку і бачыць – да берага хваля прыбіла нешта падобнае на наканечнік дзіды. Аддаў археолагам на экспертызу – тыя вызначылі: першае тысячагоддзе да нашай эры! Гэта дае падставу Пятру Паўлавічу сцвярджаць, што месца гэта – цэнтр Еўропы – малавывучанае. А знаходку сваю ён захоўвае для будучага музея, які калі-небудзь павінен тут з'явіцца.

С. Дзядзінкіна